

Мары — збываюцца!

# ВЫНАЙСЦІ... ТАБЛЕТКУ,

## або Каму не дае спакою валяр'янка

**У глыбіні тэрыторыі Барысаўскага завода медыцынскіх прэпаратаў хаваецца непрыкметны шэры будынак. Нягледзячы на памер і сціплы выгляд, яго значэнне цяжка пераацаніць — работа вялікіх вытворчых цэхаў без гэтага будынка наўрад ці магчымая. Гэта лабараторыя цвёрдых лекавых формаў, дзе займаюцца распрацоўкай новых таблетак і аналагаў дарагіх замежных прэпаратаў. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» пагутарылі з яе супрацоўнікам, маладым інжынерам-тэхнолагам першай катэгорыі Максімам СКОТНІКАВЫМ.**

— Працаваць на «Барысаўскі завод медпрэпаратаў» я прыехаў у 2007 годзе, — уводзіць у курс справы тэхнолаг. — Да гэтага вучыўся ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце на спецыяльнасці «Біятэхналогія». У той час яе выпускнікі працавалі ў розных адгалінаваннях прамысловасці: ад харчовай да фармацэўтыкі. Выбраў такую спецыяльнасць, бо ў старшых класах пачаў захапляцца хіміяй, удзельнічаў у алімпіядах па гэтым прадмеце, неаднойчы выходзіў на «вобласць», перамагаў у рэспубліканскім конкурсе юнага эколага. Калі шчыра, нават не думаў, што апынуся тут: сам вырас у Аршанскім раёне, у ваенным гарадку Балбасава. Але калі надышоў час размеркавання, выбраў Барысаў — адправіўся сюды разам з іншымі выпускнікамі.

Максім успамінае, што яшчэ тады бачыў сябе ў якасці навуковага супрацоўніка, які займаецца распрацоўкай новых лекаў. У БДТУ ён пачаў навукова-даследчую працу: займаўся праблемай удасканалення вытворчасці настойкі з валяр'яну, спрабаваў атрымаць большую колькасць актыўных рэчываў пры дапамозе ўльтрагуку, і на будучым месцы працы планаваў працягваць гэты кірунак. Але лёс распарадзіўся інакш: яго накіравалі ў таблетачны цэх, дзе выраблаюць валяр'янку, на пасаду майстра. Зрэшты, гэта таксама дапамагло станаўленню навукоўца, бо ён блізка пазнаёміўся з вытворчым працэсам.

— Не магу сказаць, што тая работа мне не падабалася, — падкрэслівае Максім. — Наадварот, калектыў мяне прыняў, у нас атрымалася выдатная змена, адна з самых маладых. Працаваць сапраўды было цікава. Паралельна сам вырашыў развівацца далей і паступіў вучыцца ў Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ. Атрымаў дыплом па спецыяльнасці «Менеджмент і кіраванне персаналам». Пасля двух гадоў адпрацоўкі папрасіў, каб мяне нарэшце перавялі ў лабараторыю, дзе я знаходжуся і цяпер.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

На новым месцы Максім заняўся непасрэдна распрацоўкай новых лекавых формаў. Галоўны кірунак работы — стварэнне так званых джэнерыкаў, прасцей кажучы, танных аналагаў дарагіх замежных прэпаратаў. За сем гадоў Максім распрацаваў каля дзесяці такіх лекавых сродкаў, усе яны прадаюцца ў аптэках: «Рыбаверын», «Німесулід», «Мелаксікам», «Бісапралол», «Рэспірыдон», «Кліндацыл»...

— Нягледзячы на тое, што я актыўна займаўся джэнерыкамі, валяр'янка таксама не выходзіла ў мяне з галавы, — кажа інжынер-тэхнолаг. — Вельмі важна, што ў нас на заводзе вытворчасць гэтага гамеапатычнага прэпарата адбываецца па поўным цыкле. Прывозяць сыравіну — здробнены корань валяр'яну, які вырошчваюць на вопытнай

**«Я магу бачыць вынікі сваёй працы — гэта лекі, якія дапамагаюць людзям, Менавіта тут я на сваім месцы».**

базе, яго засыпаюць у вялікія ёмістасці (перкалятары), заліваюць спіртаводнай сумессю, настойваюць, выпарваюць і атрымліваюць гатовае рэчыва — экстракт. Праблема была ў тым, што з-за невысокай канцэнтрацыі карыснага рэчыва для дасягнення тэрапеўтычнага эфекту трэба было спажыць адразу вялікую колькасць таблетак. І мы задумаліся над стварэннем новай.

Спачатку на заводзе пайшлі простым шляхам — павялічылі памер таблеткі ў некалькі разоў. Прэпарат атрымаў назву «Валяр'яна Фортэ» і пайшоў у вытворчасць, але пазнейшыя даследаванні паказалі, што нават гэтая канцэнтрацыя таксама недастатковая. Таму Максім працягваў работу і здолеў знайсці рашэнне праблемы. Калі тлумачыць «на пальцах», спецыяліст распрацаваў абсалютна новы састаў таблеткі, а новая тэхналогія дазволіла пазбегнуць непатрэбнага дадатковага раскладання экстракту пры выпарванні. Эфект ад ужывання такога лекавага сродку стаў мацнейшым у разы.

Новая таблетка, якая ўжо паступае ў беларускія аптэкі, атрымала назву «Рэвалон-600». Рыхтуецца да выхаду яна і меншага аб'ёму — «Рэвалон-300». Максім адправіў заяўку на атрыманне Еўразійскага патэнта, які будзе звязаны з гэтай распрацоўкай.



Увогуле, на стварэнне аднаго прэпарата-джэнэрыка, па словах інжынера-тэхнолага, патрабуецца каля пяці гадоў. Падчас распрацоўкі робяцца прататыпы таблетак, якія праходзяць шматлікія выпрабаванні і даследаванні. Іх правяраюць па разнастайных паказчыках якасці і, самае галоўнае, усё гэта параўноўваецца з арыгіналам. Нават калі ўсё супадае, гэта далёка не канец. Далей — тэарэтычная і практычная экспертызы. Апошняя стадыя — клінічныя выпрабаванні. Калі няма сур'ёзных пабочных эфектаў і іншых праблем, завод атрымлівае дазвол на выпуск прэпарата.

— Зрабіць таблетку — цэлае мастацтва, — дзеліцца спецыяліст. — Ты спрабуеш розныя камбінацыі дзеючых і дапаможных рэчываў, пакуль не атрымаецца поўны аналаг арыгінала, які будзе каштаваць у разы танней.

Вядома, для такіх сур'ёзных задач патрэбная не менш сур'ёзная тэхніка. Максім праводзіць нам невялікую экскурсію па памяшканнях. Чаго тут толькі няма: ад прэсаў, на якіх фармуюцца таблеткі, да ўстановак, дзе можна адразу прааналізаваць атрыманае.

Яшчэ ва ўніверсітэце Максім удзельнічаў у рабоце народнага студэнцкага паэтычнага тэатра «Звон», які існуе і сёння. Атрымаў там спецыяльнасць «кіраўнік тэатра малых формаў і арганізатар культмасавай работы». Нядзіўна, што і сёння хлопец з'яўляецца вядучым завадскога КВЗ, шматлікіх конкурсаў і фестываляў.

— Чаму мне падабаецца работа ў вытворча-тэхнічнай лабараторыі? — перапытвае інжынер-тэхнолаг. — Я магу бачыць вынікі сваёй працы — гэта лекі, якія дапамагаюць людзям. Менавіта тут я на сваім месцы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
*Мінск — Барысаў — Мінск.*

# Кветкі ад Гошы

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— А як вы трапілі ў цырк?***

— Аднойчы мяне запрасілі туды знаёмыя. Спачатку думала, што паклікалі проста паглядзець выступленне, але мяне правялі не ў залу, а адчынілі дзверы нейкага пакоя і проста запіхнулі ўнутр са словамі «Вось яна!» Стаю разгубленая, бачу, за сталом два дзядзечкі гарбату п'юць, на вешалцы — касцюмы для выступленняў. Я тады пачала сітуацыю выпраўляць: пацікавілася, ці патрэбныя коні, чым магу паспрыяць — так пазнаёмілася з Барысам Лазаравым, кіраўніком нумара «Джыгіты», дапамагла яму знайсці маладых коней, потым разам рыхтавалі жывёл да выступленняў, пакуль трупа не з'ехала на гастролі. Другі раз сустрэліся, калі была ў дэкрэтным адпачынку. Лазараў патэлефанаваў і прапанаваў заходзіць. Праз нейкі час я ўжо была служачай, потым займела свайго каня, пачала ставіць нумары. І ўжо 12 гадоў як працую ў цырку.

***— Памятаеце, як упершыню сустрэліся са сваімі гадаванцамі?***

**«Складанасцяў з занадта разумнай жывёлай хапае. На выступленні ніколі не здагадаешся, калі конь будзе выконваць нумар, а калі пачне імправізаваць».**

— Поні Масяню забрала яшчэ жарабём з племяннай гаспадаркі з-пад Мінска. Прасіла ў загадчыка: «Дайце самага маленькага поні, які ў вас ёсць у табуне». Цяпер Масяні чатыры гады, і сёлета ён упершыню выступае ў праграме. У першы тыдзень страшэнна хваляваўся і выскокваў за кулісы з напалоханымі вачыма — мноства людзей, новыя пахі, гукі, асаблівая энергетыка ў зале... Але цяпер паступова прывыкае да ўвагі і апладысментаў. Другому каню, Гошу, ужо трынаццаць гадоў. Былая гаспадыня прывезла яго з Расіі, дзе выратавала ад продажу на мясакамбінат. Праз нейкі час выявілася, што Гоша надзвычай разумны, ён мог адчыняць любыя запоры і сыходзіць у стойлы да суседзяў. Гаспадыні такія візіты надакучылі, і яна аддала каня ў коннаспартыўную школу, а там яго ўжо прапанавалі мне. Конь аказаўся сапраўды кемлівым, працаваць з ім надзвычай цікава. Хоць і складанасцяў з занадта разумнай жывёлай хапае. На выступленні ніколі не здагадаешся, калі конь будзе выконваць нумар, а калі пачне імправізаваць. У нас у праграме ёсць момант, калі Гоша павінен прынесці мне букет кветак. Дык ён можа кветкі ўзяць і пайсці дражніцца ў залу. Працягвае чалавеку «падарунак» цераз бар'ер, той збіраецца забраць, а Гоша ўжо адхіліўся і іншаму гледачу прапануе. І нікому не аддае.

***— Колькі часу ў сярэднім рыхтуецца нумар?***

— Ад першага трука на манежы да таго моманту, калі жывёла перад гледачамі зможа стабільна адпрацоўваць нумар, могуць прайсці гады. Усё адбываецца па-рознаму. Часам нейкі элемент не атрымліваецца месяцамі, напрыклад, у мяне быў конь, з якім мы болей за год трэніравалі паклон. А аднойчы ён проста ўзяў і пакланіўся.

***— Якім чынам можна прымусіць жывёлу зрабіць нешта ёй неўласцівае, напрыклад, для каня — сесці на заднія ногі?***

— Ні ў адной краіне няма спецыяльнай школы для дрэсіроўшчыкаў, нейкі вопыт работы з коньмі ў мяне застаўся з коннаспартыўнай школы, нешта вынесла з работы на конезаводзе, потым назірала, як працуюць іншыя дрэсіроўшчыкі. Часам даводзіцца чуць меркаванне, што ў цырку здзекуюцца са звяроў. Я не сцвярджаю, што ўсе людзі абыходзяцца з жывёламі адэкватна, але такія, як правіла, у цырку не затрымліваюцца. Я стараюся заахвоціць гадаванцаў, падкормліваю іх яблыкамі, сухарыкамі, сушкамі, цукрам. Калі ў Беларусь прыехаў румынскі дрэсіроўшчык Штэфан Плешаяну, ён вырашыў мне дапамагчы з разнастайнасцю нумара, падчас рэпетыцыі падышоў і прапанаваў: «А давай мы каня навучым ляжаць? Жывёла, бачна, разумная, за дзесяць рэпетыцый асвоіць». Склікалі брыгаду служачых і агульнымі намаганнямі паклалі Гошу. Праз пяць рэпетыцый



Фота Надзеі БУЖАН.

конь спакусіўся пачастункам і лёг сам. Штэфан на гэтым не спыніўся і прапанаваў навучыць Гошу садзіцца, прыносіць рэчы. А потым асобныя кавалачкі абраслі ідэяй і з'явіўся нумар «Каўбоі», які цяпер ідзе ў праграме «Трыумфатары арэны».

***— Вы вучыце коней трукам, складаеце нумар, падбіраеце музыку. Пра што яшчэ трэба паклапаціцца перад тым, як выйсці да гледачоў?***

— Павінна быць пэўная артыстычная падрыхтоўка. Акрамя таго, на манежы дрэсіроўшчык пастаянна кантралюе свой настрой. Неабходна заставацца сабраным, спакойным, бо гадаванец заўсёды арыентуецца на цябе. Часам жывёла выходзіць на манеж у дрэнным настроі, і ёй не растлумачыш, што гэта работа. Таму стараешся настроіць гадаванца яшчэ за кулісамі. Калі конь занадта радасны — адпраўляеш пабегаць, пакуль не супакоіцца, калі сумны, дазваляеш колькі хвілін падурэць, каб да гледачоў выйшаў гатовы працаваць.

***— Ці бываюць у жывёл і дрэсіроўшчыкаў канікулы?***

— Калі ў праграме няма нумароў, то часам дазваляем сабе адпачыць тыдзень ад трукаў. Коням без руху нельга, таму яны проста бегаюць, дурэюць. Калі ёсць магчымасць, можам выехаць за горад. Падчас рамонту ў цырку нас часова размясцілі ў шапіто каля станцыі метро «Усход». Там можна было кожны ранак выязджаць у лес, слухаць птушак і «пужаць» спартсменаў, якія бегалі па сцежках.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*